**УСЁ СЫХОДЗІЦЬ, А ТВОРЧАСЦЬ ЗАСТАЕЦЦА НАЗАЎСЁДЫ**
Клуб аматараў мастацкага слова «КЛУмБа» БДУ адзначыў свой дзявяты дзень нараджэння
Стар. 2

**ЛЮСТЭРКА БЕЛАРУСКАГА ТУРЫЗМУ**
Кафедра міжнароднага турызму на факультэце міжнародных адносін БДУ адзначыла сваё 25-годдзе
Стар. 3

**АД КАСТАМІЗАЦЫІ – ДА МТСІКА**
У БДУ прайшоў конкурс студэнцкіх ініцыятыў Space Hackathon with MTC
Стар. 4

**СІЛА НАВУКІ, АБО ЯК НАШЫ НАВУКОЎЦЫ ВЫРАТАВАЛІ ВЯРБЛЮДА З ЭМІРАТАЎ**
Пагаварылі з біёлагам Максімам Патаповічам пра ўнікальныя лекі
Стар. 5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

30 кастрычніка 2023 года, № 10 (2275)

## Чуць і быць пачутым: у БДУ рэалізуецца праект «Дыялог рэктара са студэнтамі»






Праект «Дыялог рэктара са студэнтамі» рэалізуецца ў БДУ. Гэта сацыяльна значная ініцыятыва, якая накіравана на фарміраванне ў моладзі грамадзянскай адказнасці, патрыятызму, інфармацыйнай пісьменнасці і далучэнне яе да карпаратыўных каштоўнасцяў БДУ. Праект прадугледжвае стварэнне адкрытага камунікатыўнага асяроддзя для даверных і свабодных зносін кіраўніцтва ВНУ са студэнтамі.

Яго запуск стаў вынікам запыту моладзі на экспертныя сустрэчы для абмеркавання грамадска-палітычных, кіраўнічых, патрыятычных, сацыяльных тэм. Ва ўмовах знешніх выклікаў і ўздзеяння дыялог застаецца найбольш эфектыўным і запатрабаваным для маладых людзей у атрыманні карысных растлумачэнняў і дакладнай інфармацыі па гэтых пытаннях.

Асноўны акцэнт у праекце зроблены на сустрэчах рэктара БДУ Андрэя Караля з навучэнцамі розных курсаў і спецыяльнасцяў. Фармат і тэматыку выбіраюць самі студэнты. Галоўным у вызначэнні зместу з'яўляецца актуальнасць і адсутнасць дублявання зместу размовы на розных факультэтах. Такі падыход выкліканы намерам абмеркаваць і разгледзець як мага большую колькасць пытанняў. У сустрэчах удзельнічаюць актывісты, старасты навучальных груп, лідары меркаванняў сярод моладзі. Па выніках дыялогу яны дзеляцца са сваімі аднагрупнікамі ключавымі тэзісамі мерапрыемства, уражаннямі і атрыманымі рэкамендацыямі. Акрамя таго, рашэннем па ўцягванні ў абмеркаванне максімальнай колькасці студэнтаў стала асвятленне сустрэч на ўсіх інфармацыйных рэсурсах БДУ. У рэжыме рэальнага часу размяшчаюцца паведамленні на сайце ВНУ і пасты ў тэлеграм-канале і сацыяльных сетках. Падрабязныя відэасправаздачы даступныя на ютуб-канале БДУ. Атрымаць інфармацыю пра ход праекта студэнты могуць на любым з рэсурсаў з улікам сваіх пераваг і магчымасцяў.

На дадзены момант рэктар сустрэўся з будучымі эканамістамі, хімікамі, філосафамі, сацыёлагамі, псіхолагамі, радыёфізікамі. Найбольшую цікавасць выклікаюць грамадска-палітычныя пытанні, гавораць пра ролю ўніверсітэта ў фарміраванні будучых лідараў меркаванняў і перавагу беларускай адукацыі ў параўнанні з замежнай. Выбарчая кампанія, якая неўзабаве распачнецца, будуецца вакол абмеркаванняў новаўвядзенняў, адказнасці кожнага ў прыняцці рашэнняў і палітычнай пісьменнасці. Матэрыяльна-тэхнічныя пытанні, паляпшэнне ўмоў пражывання ў інтэрнатах таксама не застаюцца без увагі кіраўніцтва БДУ. Цікавяцца студэнты і прыватным, пытаюцца рэктара пра сакрэты яго поспеху, улюбёныя кнігі, формы адпачынку, матывацыю і стварэнне.

Плануецца, што да дыялогу далучацца студэнты ўсіх факультэтаў БДУ. Акрамя таго, дадзеная практыка будзе распаўсюджана і на калектывы супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

Ініцыятывы па выбудоўванні эфектыўнай камунікацыі паміж моладдзю і кіраўніцтвам у БДУ рэалізуюцца пастаянна. У прыватнасці, у мінулым навучальным годзе стартаваў студэнцкі відэапраект «Кропкі над Ё». Ён дапамагае растлумачыць складаныя пытанні пра адукацыю, навуку, кіраўнічыя рашэнні ВНУ зразумелай для моладзі мовай. Так, студэнты факультэта журналістыкі збіраюць пытанні і потым задаюць іх кіраўнікам розных падраздзяленняў ВНУ. Выпускі з відэаінтэрв'ю размяшчаюцца на ютуб-канале і ў сацыяльных сетках БДУ.





**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

Універсітэт
30 кастрычніка 2023 года, № 10 (2275)

# Усё сыходзіць, а творчасць застаецца назаўсёды

## Клуб аматараў мастацкага слова «КЛУмБа» БДУ адзначыў свой дзявяты дзень нараджэння

**Спектакль, квест, літаратурная «мафія» – у якіх толькі фарматах не праходзілі дні нараджэння аб'яднання. Сёлета падмуркам святочнага вечара стала адкрыццё літаратурнай кавярні «НЕслуЧАЙНАЯ встреча» ў сценах Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.**


*Марына Панарад і Кацярына Роўда частуюць гасцей*

«Персаналам» на пляцоўцы сталі яе супрацоўнікі, а ў ролі адміністратара выступіла кіраўнік клуба член Саюза пісьменнікаў Беларусі Кацярына Роўда.

– Падрыхтоўка да дня нараджэння «КЛУмБы» з кожным годам становіцца для нас усё большай галаваломкай. Гэта тыя выпадкі, калі мы разумеем, што трэба сабраць разам выпускнікоў БДУ, звязаных з аб'яднаннем, цяперашніх актывістаў і тых, хто мог бы зацікавіцца нашай дзейнасцю і далучыцца. Разам з калегамі мы не аднойчы спрабавалі знайсці канцэпцыю мерапрыемства, раіліся, абмяркоўвалі варыянты, але хацелася чагосьці даступнага, нязмушанага і жывога, – падзялілася Кацярына Роўда. – Мы зразумелі, што кавярня – тое самае месца, дзе маглі б сустрэцца нашы аматары мастацкага слова, якія з гадамі сталі сур'ёзнымі аўтарамі з уласнымі кнігамі, і запрошаныя госці, і тыя, хто сам пакуль не ведае пра моц свайго творчага патэнцыялу.

Дарэчы, менавіта за кубачкам кавы, як кажуць самі клумбаўцы, у іх і нараджаюцца «кавярныя» планы. Таму назву кавярні выбіралі з сэнсам. Па-першае, святочную сустрэчу можна назваць невыпадковай, паколькі яна была запланаванай. Нават госці, якія трапілі на «КЛУмБу» ўпершыню, на думку арганізатараў вечара, аказаліся там невыпадкова. Па-другое, не «чайная» яна (як сцвярджаюць вялікія літары) таму, што напоі і стравы ў меню былі прапанаваны самыя разнастайныя. Тут можна было пакаштаваць кактэйлі «Тондзель» і «Пятровіч», эліксір «Бодрыкаў», тарталеткі «Цвірачкі», бутэрброды «Кветкавыя ветразі» і інш. Адным словам, усе прысмакі былі звязаныя з удзельнікамі клуба.


*Пісьменнік Анатоль Зэкаў*

У «НЕслуЧАЙНОЙ встрече» можна было пачаставацца, адказаўшы на пытанне з літаратуры. Дзе знаходзіцца «працоўнае месца» ката вучонага, дзе нарадзіўся Калабок, якой садавіной аб'еўся Чабурашка, чым «запраўляўся» Карлсан – вясёлыя задачкі ад вядучага бібліятэкара аддзела гуманітарна-асветніцкай работы і папулярызацыі кніжных помнікаў Фундаментальнай бібліятэкі Марыны Панарад прыйшліся надзвычай дарэчы.

– Ты ведаеш, на чым паехаў у Ленінград чалавек рассеяны з вуліцы Басейнай? – чуецца з аднаго боку.

– Вельмі смешна, што я не магу адказаць ні на адно пытанне, – смяюцца з другога.

Завіталі на дзень нараджэння сябры «КЛУмБы» – беларускія пісьменнікі і паэты. Так, добрага сябра аб'яднання Анатоля Зэкава можна справядліва лічыць першым клумбаўцам. Больш за тое, ідэя назвы клуба належыць менавіта яму. Анатоль Мікалаевіч быў рэдактарам першага зборніка «КЛУмБы» «Кветкавыя ветразі», пісаў рэцэнзіі на альманах «аБДУмана» і дапамог многім удзельнікам з друкам іх твораў. З рук Кацярыны Роўда ён атрымаў значок аб'яднання і калаж сваіх фотаздымкаў з моладдзю.

Кацярына Стройлава – «гадаванец» клуба. Сёння яна член Саюза пісьменнікаў Беларусі і аўтар 8 паэтычных зборнікаў. На дні нараджэння «КЛУмБы» дзяўчына прэзентавала сваю новую кнігу «Блуканні душы». Дарэчы, у гэты дзень можна было пагартаць і «Сонечны горад», зборнік апавяданняў даўняга клумбаўца – супрацоўніка аддзела ўпраўлення па справах культуры БДУ Андрэя Папова. А ўпершыню гасцямі аб'яднання сталі пісьменнік-фантаст Сяргей Слюсарэнка і дзіцячая пісьменніца Людміла Адзінцова. Тут клумбаўцы не толькі пачулі шмат гісторый запрошаных гасцей, але і засыпалі іх пытаннямі. Таксама хлопцы і дзяўчаты паўдзельнічалі ў адкрытым мікрафоне – пачыталі вершы, паспявалі, падзяліліся ідэямі.

Далей прысутных чакаў «кот у мяшку». Выцягнуць яго адтуль выпала пяцярым удзельнікам свята: яны павінны былі прадэкламаваць вершы «старэйшых» сяброў «КЛУмБы» – Івана Цвіркі, Асі Айсберг, Настассі Кароткачывай, Кацярыны Роўда і Ігара Пятровіча. Найлепшаму чытальніку ўручылі прыз ад аб'яднання – вялікі каляндар на будучы год з выявай ката, адтуль і задума назвы конкурсу.


*Дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Уладзімір Кулажанка адкрывае кавярню «НЕслуЧАЙНАЯ встреча»*

Дарэчы, самым лепшым выкананнем прызналі прачытанне верша на беларускай мове студэнта з Таджыкістана Лоіка Дадаева. Хлопец вучыцца ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, і на падобным святе ён апынуўся ўпершыню.



– Мая радзіма – гэта горны рэгіён, дзе з раніцы чуваць гукі рэчкі, птушак. Тут старажытныя іранскія народы не асіміляваліся з астатнімі, таму і захавалі 4 мовы. Я пачаў знаёміцца з таджыкскай літаратурай, пасля – з персідскай, адкрыў для сябе Амара Хаяма. Адначасова з гэтым я зацікавіўся рускай мовай і літаратурай і зразумеў, што паэзія і творчасць даюць чалавеку ўражанні, якія немагчыма апісаць. Спадзяюся, што ў будучыні адкрыю для сябе і беларускую літаратуру, – адзначыў студэнт. – Вывучаючы розныя мовы і культуры, я прыйшоў да высновы, што ўсе людзі, незалежна ад мовы ці нацыянальнасці, вельмі падобныя. І сёння адчуў гэта як ніколі.

На «КЛУмБу» ўжо каторы год прыходзяць не толькі новыя ўдзельнікі, але і выпускнікі. Сакрэт гэтага, на думку кіраўніка аб'яднання, крыецца ў шчырасці:

– У апытанцы для адной з газет клумбаўцы розных узростаў пісалі пра сяброўства, натхненне, падтрымку, сутворчасць, узнёсласць, веру і любоў. Так і ёсць! «КЛУмБа» – гэта не школа паэтаў ці празаікаў, не рэдактарска-карэктарская студыя, не шэраг творчых конкурсаў і батлаў. Гэта планета, якая круціцца (з рознай хуткасцю, але пастаянна), вакол якой круціцца, на якой бурліць творчае жыццё і пануе тая самая шчырасць, з якой усё і пачалося, – перакананая Кацярына Роўда.

Дарэчы, гісторыя самой дзяўчыны ў аб'яднанні пачалася з вучобы на філалагічным факультэце. Кацярына прыйшла на прэзентацыю кнігі, дзе пазнаёмілася з вядучым бібліятэкарам аддзела гуманітарна-асветніцкай работы і папулярызацыі кніжных помнікаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Ірынай Шкіронак. Праз некаторы час дзяўчына сама захацела паспрабаваць сябе ў бібліятэчнай справе, стала паказваць і чытаць свае вершы. Тады ж яна вырашыла падаць іх на літаратурны конкурс «Славянскі калейдаскоп», дзе і перамагла ажно ў трох намінацыях:

– Мяне і іншых лаўрэатаў не проста ўзнагародзілі, а сабралі разам у чытальнай зале аддзела гуманітарна-асветніцкай работы і папулярызацыі кніжных помнікаў. Потым зноў. І яшчэ. Пад чулым кіраўніцтвам нашай Ірыны Сцяпанаўны і нарадзілася «КЛУмБа».

Марыя Чакрыгіна таксама даўні сябар аб'яднання. Зараз яна працуе педагогам-арганізатарам аддзела метадычнай і сацыяльна-педагагічнай работы Студэнцкага гарадка БДУ. Дзяўчына кажа, што пасля паступлення ва ўніверсітэт было цяжка адаптавацца да вялікага горада, але «КЛУмБа» дапамагла ёй у гэтым.

Пра непарыўную сувязь з аб'яднаннем сведчаць таксама відэапаведамленні ад тых, хто не змог прысутнічаць на святе – Аліны і Івана Цвірко, Ігара Пятровіча, Марты Кудзінай. Такі фармат – адзін са шматлікіх спосабаў пабачыцца ў гэты знакавы для клумбаўцаў дзень. А для Івана і Аліны Цвірко прыход у аб'яднанне стаў лёсавызначальным: тут яны пазнаёміліся, а потым абвясцілі, што збіраюцца ажаніцца:

– Дарагія нашы клумбаўцы, віншуем вас з днём нараджэння! Гэта дата вельмі-вельмі важная для кожнага з нас. Мы ўжо не жывём у Мінску і фізічна не можам быць з вамі, але вы заўсёды побач з намі ў сваіх кнігах. «КЛУмБа» – вялізны кавалак у нашых сэрцах «праз гады і кіламетры», – перадалі відэапрывітанне з Віцебска маладыя людзі.



Куратар аб'яднання Ірына Шкіронак упэўнена: калі б многія ўдзельнікі клуба мелі магчымасць прыйсці, то ўсе яны былі б на святочным вечары. Пра гэта сведчыць і тое, што з мерапрыемстваў клуба моладзь разыходзіцца неахвотна. І, паколькі большасць з іх праходзяць увечары, сустрэчы аб'яднання пачалі называць «засядзелкамі». «Гэта таму, што ўсё сыходзіць, а творчасць застаецца назаўсёды», – жартуюць клумбаўцы.

– Вось сёння ідзём у метро, а надвор'е шэрае, накрапвае дожджык. А пасля як заўсміхаліся – і заззяла ўсё навокал. А ўсміхаліся мы чаму? Бо ехалі на дзень нараджэння «КЛУмБы»! Тут, дарэчы, у любое надвор'е сонца свеціць, – заўважылі ўдзельнікі ўрачыстасці. – Святочны вечар быў чароўным: прэзентацыя кніг беларускіх пісьменнікаў, адкрыты мікрафон, цікавая ідэя з літаратурнай кавярняй. Калі людзі ўпершыню трапляюць у незнаёмае асяроддзе, звычайна ім няпроста. А тут усё было зроблена з максімальнай «клумбаўскай» любоўю.

У літаратурнай кавярні, бясспрэчна, не абышлося без «чаявых». Імі сталі пажаданні аб'яднанню ад гасцей: «КЛУмБа» – гэта тое, што патрэбна!», «Гэта быў самы атмасферны дзень нараджэння, на якім я была. Такія вы зайкі», «Шчаслівы ўбачыць вясёлку пачуццяў над гэтым месцам». Як ні круці, але такія «чаявыя» ў дзень нараджэння – бясцэнныя.

**Ірына ІВАШКА**

# Люстэрка беларускага турызму

**Нядаўна кафедра міжнароднага турызму на факультэце міжнародных адносін БДУ адзначыла сваё 25-годдзе!**

**Гэта падзея стала падставай не толькі для віншаванняў, але і для абмеркавання перспектыў развіцця турыстычнага бізнесу ў Беларусі. Менавіта выпускнікі міжнароднага турызму ўплываюць на працу гэтай сферы. За навучаннем кожнага з іх назіраў нязменны загадчык кафедры Леанід Міхайлавіч Гайдукевіч. Ён падзяліўся з нашай рэдакцыяй, як развівалася кафедра на працягу 25 гадоў.**



### Гісторыя з'яўлення кафедры

*– Стварылася кафедра 5 кастрычніка 1998 года ў выніку грамадска-палітычнай трансфармацыі, якая адбылася на пачатку 1990-х гадоў. На з'яўленне кафедры паўплываў шэраг фактараў. Па-першае, адкрыццё Беларусі знешняму свету. У краіне пачалося фарміраванне новага аблічча нацыянальнага турыстычнага комплексу. Па-другое, не было ВНУ, якія рыхтуюць кадры для турсектара, а патрэба ў гэтых кадрах значна вырасла, – распавядае Леанід Міхайлавіч.*

На этапе станаўлення кафедры выявіліся першыя цяжкасці. Яны закранулі забяспечанасць студэнтаў навучальна-метадычнай літаратурай. На той момант у наяўнасці былі расійскія падручнікі па менеджменце і турызме, але яны не зусім адпавядалі патрабаванням беларускай адукацыі. Выкладчыкі хутка пераканаліся, што ў турызме нашай краіны ёсць свая спецыфіка. А замежнай літаратуры ў перакладзе было вельмі мала.

Перад калектывам кафедры паўстала задача: за кароткі час падрыхтаваць і выдаць аўтарскія падручнікі. Намаганнямі беларускіх і замежных спецыялістаў да 2000 года выйшлі першыя дапаможнікі «Геаграфія міжнароднага турызму». Пасля яны сталі запатрабаванымі і іншымі навучальнымі ўстановамі краіны.

### Важныя праекты ў жыцці кафедры

Наступным этапам падрыхтоўкі навучальных выданняў стаў удзел кафедры ў міжнародным адукацыйным праекце TEMPUS. Падчас гэтага праекта калектыў выкладчыкаў прайшоў прафесійную стажыроўку ва ўніверсітэтах Германіі, Чэхіі, Славакіі, Італіі. Вынікам гэтых стажыровак стала падрыхтоўка навучальных дапаможнікаў фактычна па ўсіх дысцыплінах эканамічнага блока, якія чытаюцца на кафедры. Комплекс вучэбна-адукацыйных мерапрыемстваў гэтага праекта дазволіў кафедры міжнароднага турызму не толькі падрыхтаваць сучасную навучальна-метадычную літаратуру, але і прастажыраваць студэнтаў і магістрантаў у адукацыйных установах Еўропы. Дзякуючы гэтаму з'явіўся першы ў краіне эксперыментальны навучальны план па дадзенай спецыяльнасці з улікам рэкамендацый Балонскага працэсу.

У далейшым папаўненне вучэбна-метадычнай літаратурай вялося на кафедры падчас выканання дзяржаўных навукова-даследчых работ і ўдзелу ў міжнародных праектах. У гэты перыяд адужэлі і нацыянальныя турыстычныя аператары і турагенцтвы. Кафедра шчыльна працавала з ТАА «ТОП-ТУР», «Вокруг света», «Падэвюс», ТДА «Колор Лэнд», «Трэвел» і іншымі кампаніямі.

Асабліва ўдалым праектам кафедры стаў БГА «Адпачынак у вёсцы». У 2015 годзе на яго базе быў створаны філіял кафедры. Гэты праект дазволіў падключаць студэнтаў да дзейнасці беларускіх аграсядзіб. Такое супрацоўніцтва дало свой плён. Студэнты праходзілі вытворчую практыку, распрацоўвалі праекты па іх заяўках, удзельнічалі ў арганізацыі розных фестываляў і міжнародных праектаў. Яны распрацавалі першую кулінарную карту Беларусі. На той момант галоўнай праблемай сферы было распаўсюджванне інфармацыі пра агратурызм. Навучэнцы выкарыстоўвалі свае веды, каб стварыць сайты і перакласці іх на іншыя мовы. Таксама за апошнія 2-3 гады кафедра падрыхтавала каля пяці дыпломных работ на замову аграсядзіб.

*– Вынікам супрацоўніцтва стала сумесная арганізацыя штогадовай міжнароднай навуковай канферэнцыі па праблемах агратурызму. Можна сказаць, што гэта значна ўмацавала пазіцыі беларускага сельскага турызму на міжнароднай арэне, – дадае загадчык кафедры.*

### Актуальнае жыццё кафедры

Зараз на чатырох курсах, у магістратуры і аспірантуры навучаецца больш за 320 чалавек. Разам з беларускімі студэнтамі тэарэтычную і практычную падрыхтоўку праходзяць студэнты з краін блізкага і далёкага замежжа, у тым ліку з краін СНД, Кітая, В'етнама, Нігерыі, Ірана і Грэцыі. Для студэнтаў кафедры міжнароднага турызму выкладчыкі чытаюць больш за 50 дысцыплін. Акрамя звычайных лекцыйных і семінарскіх заняткаў у адукацыйным працэсе прадугледжаны навучальныя экскурсіі, майстар-класы і курсавое праектаванне. Такія формы работы са студэнтамі даюць магчымасць пашырыць іх кругагляд, глыбей вывучыць спецыфіку развіцця сусветнага і нацыянальнага турыстычнага комплексу.



*Студэнты кафедры на практычных занятках*

Студэнты кафедры праходзяць навучальную і вытворчую практыку ў вядучых турыстычных фірмах краіны: «ТОП-ТУР», «Алатан-тур», «Смок-трэвел», «Сакуб», «Туссон-вояж», у Міністэрстве спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным агенцтве па турызме. Іх кіраўнікоў запрашаюць у якасці гасцей і лектараў. Гэта дазволіла значна ўзмацніць практыка-арыентаванасць навучання.

З прывязкай да рэальнага бізнесу працуюць 2 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. СНДЛ «Інавацыйныя тэхналогіі ў турызме» пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка Наталлі Барысенка займаецца праблемай развіцця інклюзіўнага турызму, даследуе на практыцы даступнасць асяроддзя для турыстычных падарожжаў у Мінску. СНДЛ «Сусветная індустрыя гасціннасці» займаецца працай гасцінічнага сектара.

Магістранты кафедры навучаюцца на двух напрамках: «Менеджмент масавых падзейных мерапрыемстваў» і англамоўная магістратура «Турызм і гасціннасць».

*– Нельга не прымаць да ўвагі змены, якія адбываюцца ў сістэме міжнародных адносін. Банкрутствы тураператараў у выніку COVID-19, змены транспартнай лагістыкі ў турызме, увядзенне санкцый і іншыя прычыны адмоўна ўплываюць на сферу турызму, – разважае Леанід Міхайлавіч. – Таму мы арыентуемся на ўнутраны турызм і супрацоўніцтва з такімі краінамі, як Расія, Казахстан, Узбекістан, Арменія. Нашы выкладчыкі і студэнты ўдзельнічаюць у міжнародных навуковых канферэнцыях. Мы штогод збіраем дзве такія канферэнцыі па інклюзіўным і агратурызме. Зараз у нас адбываецца цеснае супрацоўніцтва з Расіяй па тэме сельскага турызму. Мы разам развіваемся ў гэтай сферы, і зараз у нас на стажыроўцы, у рамках абмену, знаходзяцца студэнты з Кубанскага дзяржаўнага ўніверсітэта.*

Кафедра таксама займаецца папулярызацый экалагічнага і культурна-гістарычнага турызму ў Беларусі. Навучэнцы распрацоўваюць турыстычныя маршруты па гарадах Беларусі, іншагародняя студэнты знаёмяць са сваімі роднымі мясцінамі.

Задача кафедры – пастаяннае павышэнне якасці навучальнага працэсу і яго неадрыўнасць ад практыкі. З самага пачатку важнай спецыфікай кафедры з'яўляецца моўная падрыхтоўка. Студэнты вывучаюць 2 мовы ўвесь перыяд навучання, пачынаючы з першага года. Досыць вялікі аб'ём вучэбнай нагрузкі дазваляе дасягнуць высокага ўзроўню прафесіяналізму.

Яшчэ адной тэма – развіццё інфармацыйных тэхналогій у турызме. Кафедра пашырыла блок выкладання гэтых дысцыплін з улікам сучасных патрабаванняў рынку. З гэтага года адбыўся пераход на новыя навучальныя планы, у якіх акцэнт зроблены на лічбавізацыі дысцыплін.

*– Сучасны турыстычны рынак Беларусі ва ўмовах канкурэнцыі патрабуе ўсё больш кваліфікаваных спецыялістаў, якія будуць валодаць дастатковымі ведамі і навыкамі для распрацоўкі, прасоўвання і рэалізацыі канкурэнтаздольнага турыстычнага прадукту. Кіраўнікі турпрадпрыемстваў хочуць бачыць падрыхтаваных маладых спецыялістаў, – упэўнены Леанід Міхайлавіч. – Але, нягледзячы на вытворчую практыку, якую студэнты праходзяць у працэсе навучання, сапраўдныя веды прыходзяць толькі падчас працы. У большасці выпадкаў маладых спецыялістаў даводзіцца давучваць на вытворчасці ў форме настаўніцтва, што змяншае выніковасць працы персаналу. Сёння турфірмы імкнуцца атрымаць прафесійнага спецыяліста з добрымі базавымі ведамі замежнай мовы, эканомікі, камунікацый і з вопытам практычнай падрыхтоўкі не менш як 2 гады. І, каб жаданні турфірмаў і выпускнікоў супадалі, неабходнае глыбейшае вытворчае ўзаемадзеянне з ВНУ краіны.*

За чвэрць стагоддзя свайго існавання кафедра стала люстэркам развіцця беларускай сферы турызму. Змены, якія адбываюцца ў свеце, не перашкаджаюць шукаць новыя напрамкі дзейнасці. У найбліжэйшай будучыні кафедра міжнароднага турызму плануе пашыраць супрацоўніцтва з ВНУ Беларусі і Расіі, абменьвацца вопытам і працягваць працаваць над тэмай інклюзіўнага і агратурызму.

**Ганна КАЗАКОВА**

Дыяна Зайкоўская, выпускніца 2020 года, маркетолаг-аналітык, менеджар па кліентынгу ў міжнароднай юрыдычнай групе REVERA:

*– Я вельмі ўдзячная кафедры за тое, што яна дае студэнтам практычныя веды і рыхтуе да жыцця. Навучанне на кафедры ідзе на стыку розных дысцыплін: эканоміка, маркетынг, менеджмент, бухгалтэрыя, моцная падрыхтоўка па замежных мовах. Гэта забяспечвае студэнтам такі шырокі кругагляд, што пасля мы можам быць паспяховымі і будаваць кар'еру ў розных сектарах эканомікі і на розных пасадах. Калі ты студэнт, ты не заўсёды можаш ацаніць важнасць і значнасць тых ведаў, якія нам даюць. Але ў далейшым яны становяцца для нас сапраўды вельмі карыснымі.*

Універсітэт
30 кастрычніка 2023 года, № 10 (2275)












Валерыя Селівонец і Настасся Турляк з галоўным прызам




# Ад кастамізацыі – да МТСіка

## У БДУ прайшоў конкурс студэнцкіх ініцыятыў Space Hackathon with МТС

**Трохдзённы конкурс інавацыйных рашэнняў аб'яднаў студэнтаў з усёй краіны, прапануючы пераможцам атрымаць прыз 5000 беларускіх рублёў і вопыт узаемадзеяння з буйным прадстаўніком бізнесу. Арганізатарамі падзеі сталі моладзевая прадпрымальніцкая супольнасць StartUp Space, стартап-цэнтр БДУ і кампанія мабільнай сувязі МТС.**

– Мы заўсёды шукаем кампаніі, якія зацікаўлены ў свежых ідэях студэнтаў і інавацыйных рашэннях для ўнутраных праектаў. Атрымалася наладзіць кантакты з кампаніяй МТС, паколькі агульныя інтарэсы ў нас сышліся. У іх была праблема, якую можна рашыць з дапамогай інтэлектуальнага патэнцыялу студэнтаў; у нас – зацікаўленасць у значным мерапрыемстве пры падтрымцы буйной арганізацыі, магчымасць даць студэнтам развівацца і зарабіць. Больш за тое, вопыт узаемадзеяння з МТС пакажа іншым кампаніям, што ўніверсітэт адкрыты да такіх прапаноў, – адзначыў кіраўнік моладзевай прадпрымальніцкай супольнасці StartUp Space БДУ Ягор Аліферка.

Жаданне далучыцца да падзеі выказалі 150 студэнтаў з усёй Беларусі. Больш за 60% удзельнікаў склалі маладыя людзі з БДУ. Таксама хакатонам зацікавіліся прадстаўнікі БНТУ, БДУІР, БДЭУ, БДТУ, МДЛУ, ГрДУ імя Янкі Купалы, БрДУ імя А.С. Пушкіна, Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці і інш. Арганізатары паставілі перад моладдзю задачу распрацаваць прататып інтэрфейсу продажу электронных сертыфікатаў у дадатку «Мой МТС». Таксама маладыя людзі маглі прапанаваць прадукты, якія пашыралі б варыянты анлайн-пакупак у інтэрнэт-краме мабільнага аператара. Сярод дадатковых магчымасцей, над якімі працавалі хлопцы і дзяўчаты, – выбар наміналу і функцыяналу сертыфіката, спосабу аплаты, адлюстраванне сертыфіката ў мабільным дадатку, перадача яго іншаму абаненту МТС і адпраўка ў месенджары.

### Бачу задачу – не бачу перашкод

Праграма хакатону падзялілася на дзве часткі: самастойную працу і адукацыйны блок – узаемадзеянне з запрошанымі спецыялістамі. У першы дзень прадстаўнікі кампаніі МТС далі ўдзельнікам тэхнічнае заданне, падзяліліся статыстыкай (колькі спажыўцоў налічвае электронны дадатак, як часта яго выкарыстоўваюць і пад.), акрэслілі крытэрыі ацэньвання іх будучых ідэй. У другі дзень запрошаныя эксперты патлумачылі студэнтам, як прасачыць шлях карыстальніка ў мабільным дадатку, стварыць прататып прадукту, расказалі пра тэхнічныя інструменты для рэалізацыі задумы. Далей фантазія студэнтаў нічым не абмяжоўвалася. Акрамя таго, арганізатары агучылі ўдзельнікам і крытэрыі ацэнкі праектаў падчас фіналу. Эксперты паабяцалі, што звернуць пільную ўвагу на апісанне карыстальніцкага шляху, якасць візуалізацыі і ўзровень працоўкі прататыпа, арыгінальнасць ідэі, якасць прэзентацыі і актыўнасць падчас хакатону.

Заключным і вырашальным этапам стаў трэці дзень, калі студэнты прадставілі свае праекты журы. Ацэньвалі вынікі працы каманд першы прарэктар БДУ Дзмітрый Курловіч, кіраўнік стартап-цэнтра БДУ Дзмітрый Мікулка і прадстаўнікі кампаніі МТС – генеральны дырэктар Уладзіслаў Андрэйчанка, першы намеснік генеральнага дырэктара Міхаіл Панамароў, намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях Мікалай Булаш, а таксама начальнік аддзела продажаў Аляксандр Капчук. У фінале конкурсу выступілі 17 каманд. Бізнес-цэнтр Campus, які стаў цэнтрам падзеі, аб'яднаў нямала моладзевых ідэй. Тут былі задзейнічаны выкарыстанне магчымасцей лагатыпа і «ананімныя» сертыфікаты-сюрпрызы, Telegram-бот і аплачаная дастаўка. У перапынках паміж актыўнасцямі распыталі некаторых удзельнікаў пра іх праекты.

Каманда Валерыі Максімавай прапанавала дзяліць сертыфікаты на дзве групы: для звычайных абанентаў і бізнес-карыстальнікаў. Такое рашэнне, на думку моладзі, магло б спрасціць прапанову паслуг для кліентаў розных груп і разам з тым павысіць продажы электронных сертыфікатаў. Таксама студэнты распрацавалі рэкламныя банеры для інтэрнэту, галоўнай старонкі МТС на карпаратыўным сайце і ў метро.

Уладзіслаў Мілеўскі адзначыў, што, паводле яго задумы, пакупка ў дадатку зойме да 5 клікаў. Так, калі карыстальнік зойдзе ў дадатак МТС, то ўбачыць банер з інфармацыяй пра пакупку сертыфіката. Пасля ён пяройдзе ў інтэграцыйны пакет і выбера тып сертыфіката. Апошнім крокам стане аплата паслугі. Прастата інтэрфейсу, на думку хлопца, стане штуршком у пашырэнні кліенцкай базы кампаніі і дазволіць паступова асвоіць новыя рынкі збыту прадукцыі.

Настасся Карней разам з сябрамі прапанавала стварыць платформу, на якой у сертыфікаты былі б інтэграваны ўсе прадукты і паслугі кампаніі МТС. На ёй карыстальнік змог бы адсочваць шлях сертыфіката ад пакупкі да яго ўручэння адрасату ў зручнай форме, а таксама тэрміны пагашэння. Дзяўчына выказала думку, што купленыя сертыфікаты можна будзе адправіць на нумар тэлефона ці спасылкай. Аднак, калі спасылку не выкарыстаюць да пэўнага тэрміну, сертыфікат вернецца адпраўшчыку. Пры афармленні электроннага падарунка каманда прапанавала стварыць функцыю дадавання фотаздымкаў, малюнкаў ці тэкстаў. А каб пры гэтым карыстальнік не працаваў з забароненымі законам выявамі, ён павінен будзе прыняць «карыстальніцкае пагадненне».

Канстанцін Фарына ў сваёй канцэпцыі паставіў на навізну. Укладку з электроннымі сертыфікатамі ён назваў бы «МТС-тэмпы». Такое рашэнне, лічыць хлопец, зацікавіць карыстальнікаў нязведанасцю. Ва ўкладцы абанент МТС зможа выбраць прадукт на пэўную суму, паслугу ці прыладу. Таксама малады чалавек прадугледзеў sms-напамін пра пакупку праз год.

Мацвей Лабосаў з сябрамі зрабіў ухіл не толькі на абанентаў МТС, але і на ўсіх карыстальнікаў мабільнай сувязі:

– Першы этап, які нас цікавіць, – перадпродажы. Для абанентаў мы прапануем push-паведамленне, якое будзе з'яўляцца на сайце. Калі чалавек гэтым зацікавіцца і націсне на яго, то карыстальніку прыйдзе sms, маўляў, пампуйце дадатак і дарыце родным сертыфікаты. Другі этап – продажы. Мы пераходзім да дызайну сертыфіката. Спачатку выбіраем выяву, пасля – намінал. Гэта ці канкрэтная сума, ці ўказаная карыстальнікам. Акрамя таго, калі пакупнік сертыфіката з'яўляецца абанентам МТС, ён на 3 месяцы атрымлівае пяцідзесяціпрацэнтную зніжку на які-небудзь тарыф. Такім чынам мы далучаем да продажаў не толькі прыхільнікаў кампаніі, – перадаў ідэю хлопец.

Канцэпцыя каманды Настассі Шуравай атрымала назву «Проста падары». Маладыя людзі прапанавалі «памясціць карыстальніка ў кантэкст». Кліент, памятаючы пра святочныя даты блізкіх людзей, хоча іх парадаваць. Таму маладыя людзі вырашылі ўнесці ў дадатак МТС новы функцыянал з календаром, куды кліент зможа занатоўваць важныя для яго даты. Кожны год напярэдадні такіх дзён яму будуць прыходзіць прапановы з адсылкамі да сертыфікатаў. Змены павінны таксама закрануць шлях карыстальніка: аплацяць пакупку стане магчымым па нумары тэлефона, а таксама будзе ўведзена адмена аперацыі, бо ў любы момант карыстальнік можа перадумаць.

– Кожны з вас хаця б аднойчы сутыкаўся з тым, што, рэалізоўваючы сертыфікат, заяўлены ў ім сумы або не хапала, або было зашмат. Таму мы прапануем указваць канкрэтную суму ці афармляць яго на канкрэтную паслугу. Уявіце, што ў вас ёсць сябар, які пастаянна просіць вас раздаць wi-fi. І вось МТС дае магчымасць забяспечыць яго мабільным інтэрнэтам на цэлы месяц. Праблема вырашаецца і ў вас, і ў вашага сябра. Такія сертыфікаты можна будзе выкарыстоўваць штодзень, – заўважыў Дзмітрый Навумовіч. – На пастаяннай аснове могуць выкарыстоўвацца комплексныя сертыфікаты. Напрыклад, мабільны тэлефон і навушнікі пасобку каштуюць больш, а калі на іх набываюць сертыфікат – абанент атрымлівае пэўную зніжку. Гэта, як нам падаецца, далучыць да прадукту больш аўдыторыі.

### МТСік на крок наперадзе

Пераможцам хакатону стала каманда студэнтак ФМА і ФСК БДУ **Настассі Турляк** і **Валерыі Селівонец**. Настасся ўваходзіць у склад каманды моладзевай міжуніверсітэцкай прадпрымальніцкай супольнасці StartUp Space БДУ, таму пра хакатон даведалася з сацсетак падраздзялення. Убачыўшы задачу ад МТС, дзяўчына зразумела, што гэта цікава, і адразу ж падумала пра сяброўку-дызайнера. Апошняя хутка згадзілася на прапанову паўдзельнічаць.

– Мы знаёмыя з першага класа, таму ведалі, што працаваць удзвюх нам будзе камфортна. У пачатку працы вызначылі нашу дызайн-канцэпцыю. Лера адказвала за ўвасабленне нашых ідэй як дызайнер, я – за падрыхтоўку прэзентацыі і выступленне перад экспертамі. Кожная з нас кантралявала адна адну, раіла, як зрабіць нешта яшчэ лепшым. Таму і атрымаўся класны вынік! – заўважае Настасся Турляк.

Па словах дзяўчат, адукацыйная частка мерапрыемства дапамагла ім не ў толькі ў рашэнні задачы. Лекцыі вузкіх спецыялістаў далі ўдзельнікам глыбокія веды, паколькі закраналі не адзін нейкі напрамак, а ўтрымлівалі шмат універсальнай інфармацыі.

– Такія праекты даюць магчымасць студэнтам паспрабаваць сілы ў розных сферах дзейнасці, адкрыць свае невядомыя таленты. Тут можна праверыць, ці баіцца чалавек выступаць перад публікай, знаходзіцца ў канкурэнтным асяроддзі, параўнаць сябе з іншымі студэнтамі, якія прыйшлі праверыць сябе на трываласць. А яшчэ на хакатонах можна пазнаёміцца з цікавымі людзьмі, пашырыць кругагляд і проста з карысцю правесці час, – лічаць пераможцы.

Працу над заданнем студэнткі пачалі з прадумвання варыянтаў, дзе б магла размяшчацца кнопка «Сертыфікаты», і аптымізацыі карыстальніцкага шляху. Затым падышлі да ўкаранення задуманага ў карпаратыўны стыль кампаніі. Прапанавалі дзяўчаты і інтэрактыўныя «цікавосткі» – узаемадзеянне з лагатыпам-яйкам і ўвядзенне новага персанажа – МТСіка.

– З адрозненняў нашых прапаноў ад ідэй іншых удзельнікаў можна вылучыць некалькі складнікаў. Па-першае, мы хацелі, каб чалавек, які адправіць камусьці сертыфікат, быў зацікаўлены ў яго набыцці. Таму прадугледзелі сістэму бонусаў. Калі карыстальнік набудзе сертыфікат, МТСік падорыць яму яйка, якое паступова будзе трэскацца. Разам з пакупкай трэцяга сертыфіката чалавек атрымае бонус: скідку ці балы, якія можна будзе выкарыстаць у мабільным дадатку ці крамах МТС. Так пакупка сертыфіката будзе дарыць радасць і таму, хто яго прэзентуе, і атрымальніку, – патлумачылі распрацоўшчыцы.

На пытанне наконт выйгрышу Настасся і Валерыя адказалі, што хочуць патраціць яго з розумам. Студэнткі задумаліся пра адукацыйныя курсы: сяброўкі перакананы, што найлепшая інвестыцыя – веды. Хаця і жартуюць, што без звычайных прыемных пакупак таксама не абыдзецца.

– Разуменне перамогі прыйшло да нас крыху пазней. Мы былі вельмі здзіўлены і адразу не маглі выказаць увесь спектр пачуццяў. Прыемна ўсведамляць, што калі-небудзь мы зойдзем у дадатак «Мой МТС» і ўбачым нашу задумку ў рэальнасці, – падсумавалі дзяўчаты.

Ірына ІВАШКА

# Сіла навукі, або Як нашы навукоўцы выратавалі вярблюда з Эміратаў

**Загадчык навукова-даследчай лабараторы бітэхналогіі кафедры мікрабіялогіі Максім Патаповіч ужо шмат гадоў працуе над ветэрынарнымі прэпаратамі, аналагаў якіх у свеце няма. З іх дапамогай можна змагацца са шматлікімі вірусnúmі і інфекцыйнымі захворваннямі ў жывёл. Пры гэтым тэрміны лячэння скарачаюцца ўдвая, зніжаецца смяротнасць пагалоўя, павялічваецца прыбаўка маладняку, а малако і мяса не адбракоўваюцца.**



## Як працуюць унікальныя лекі?

Лінейка прэпаратаў створана для розных відаў жывёл, пачынаючы ад хатніх, заканчваючы амаль усімі сельскагаспадарчымі: куры, свінні, каровы, коні, козы.

У аснове прэпаратаў ляжаць бялкі, якія з'яўляюцца кампанентамі імуннай сістэмы. Гэта вялікая група бялкоў, якая ўдзельнічае ў імунным адказе, выклікае ахоўныя рэакцыі арганізма пры ўзнікненні нейкіх паталагічных станаў ці інфікавання.

У лабараторыі бялкі атрымліваюць штучным шляхам з дапамогай бактэрый. Тканкі ці кроў у жывёл не бяруць. Бактэрыі напрацоўваюць рэчывы па праграме, якую ў іх закладваюць навукоўцы. У выніку такія бялкі нічым не адрозніваюцца ад каровіных, качыных або свіных. Яны складаюць аснову лекавага прэпарата, які ўводзіцца жывёле. Паколькі гэтыя рэчывы валодаюць уласцівасцю аўтаіндукцыі і самастымуляцыі, то арганізм атрымлівае сігнал, што трэба змагацца з захворваннем. І ўжо ў самім арганізме адбываецца вялікая выпрацоўка бялку, такім чынам, жывёла атрымлівае магчымасць перамагчы хваробу самастойна без выкарыстання чужародных антыбіётыкаў і хімічных кампанентаў.

– Галоўнае адрозненне нашых прэпаратаў ад антыбіётыкаў – іх выкарыстанне не патрабуе тэрмінаў вытрымкі. Нельга сёння ўкалоць антыбіётык, а заўтра піць малако, трэба чакаць, пакуль лекі выйдуць з арганізма, – уводзіць у курс справы біёлаг. – А калі ў малацэ будзе выяўлена рэштковая колькасць антыбіётыку, то ўся партыя цалкам бракуецца. З выкарыстаннем нашага прэпарата такога праблемы няма. Ніякімі аналізамі нельга адрозніць бялок, які ёсць у арганізме каровы, ад таго, які ўвялі пры лячэнні. Гэта абсалютна бяспечна, экалагічна і дае магчымасць атрымліваць чыстую прадукцыю без прымешкі хімічных рэчываў.

## З чаго ўсё пачыналася?

Пасля ўніверсітэта выпускнік не збіраўся паступаць у аспірантуру, а хацеў адразу пачаць працаваць. Варыянтаў было шмат. Думаў ісці ў крыміналістыку, судмедэкспертызу, праходзіў розныя практыкі на прадпрыемствах, але ніяк не мог знайсці тое, што яго б зацікавіла. Паваротны момант здарыўся, калі Максім сустрэў загадчыка кафедры Уладзіміра Антонавіча Паркулевіча на лесвіцы. Ён і прапанаваў паступіць у аспірантуру.

– Першыя некалькі месяцаў у мяне наогул нічога не атрымлівалася. Я быў у прыгнечаным стане. І ў адзін дзень пайшлі вынікі па тэме з бялкамі, нарэшце пачалася актыўная праца. А мяне вельмі стымулюе, калі нешта атрымліваецца. Я ўцягнуўся, пачаліся навуковыя канферэнцыі, з'явілася цікавасць да навуковай дзейнасці, – дзеліцца суразмоўца. – Першапачаткова перада мной ніхто не ставіў задачу стварыць нейкі прэпарат або перамагчы нейкую хваробу. Але ў майго навуковага кіраўніка Уладзіміра Антонавіча была ідэя зрабіць нешта сваё, арыгінальнае, менавіта для ветэрынарнай сферы. Пэўныя захады ў гэтай галіне былі і раней, але тыя работы былі звязаны з адаптацыяй чалавечых прэпаратаў для ветэрынарыі, а не стварэнне прынцыпова новых, – тлумачыць біёлаг.

З таго часу навуковец пачаў працаваць над тэмай ахоўных бялкоў. Пасля першых вынікаў паўстала пытанне, што далей з імі рабіць. Можна было проста напісаць справаздачу і заняцца іншай тэмай, але ў лабараторыі вырашылі развіць поспех і стварыць прадукт.

У выніку распрацоўка ветэрынарных прэпаратаў стала адным з асноўных напрамкаў дзейнасці ў НДЛ бітэхналогіі. Навукоўцы вырашылі, што трэба наладжваць вытворчасць прэпарата. На той момант гэта былі 2-3 найменні лекаў для сельскагаспадарчых жывёл. Зарэгістравалі прадпрыемства, атрымалі ліцэнзію. ТАА «Навукова-вытворчы цэнтр "ПраБіяТэх"» нават стаў першым рэзідэнтам універсітэцкага тэхнапарка. Пазней лінейка прэпаратаў пачала пашырацца. З'явіліся спецыфічныя лекі не толькі для сельскагаспадарчых, але і для хатніх жывёл.

– Раннія прэпараты, якія мы рэгістравалі, я называю прэпаратамі першага пакалення. Яны крыху прасцейшыя, чым тыя, якія мы робім цяпер. Гэта былі прэпараты агульнага дзеяння. Бялкі, з якіх яны складаюцца, запускаюць шмат розных рэакцый у арганізме, і атрымліваецца, што жывёла здаравее. Усе працэсы, якія адбываюцца пры ўвядзенні бялкоў, паралічыць навука яшчэ не здольная, але зараз мы лепш разумеем рэакцыі на прэпарат, – паясняе біёлаг. – Лекі, над якімі мы працуем зараз, гэта прэпараты чацвёртага пакалення. Яны больш прасунутыя, у той жа час вузканакіраваныя. Напрыклад, ёсць прэпарат, накіраваны на рэгуляцыю рэпрадуктыўнага цыкла ў буйной рагатай жывёлы, прэпараты кропкава ўздзейнічаюць на працэсы, якія адбываюцца пры імплантацыі эмбрыёна і развіцці зародка.

## Супрацоўніцтва з іншымі краінамі

У нейкі момант праца над прэпаратамі выйшла за межы краіны. Сёння нашы навукоўцы цесна супрацоўнічаюць з расійскімі ветэрынарамі. У НДЛ склалася паспяховая калабарацыя з Усерасійскім навукова-даследчым ветэрынарным інстытутам паталогіі, фармакалогіі і тэрапіі, які знаходзіцца ў Варонежы. Інстытут працуе з нашымі прэпаратамі, праводзіць выпрабаванні на жывёлах, карэктуе параметры, распрацоўвае схемы лячэння.

– Пры рэгістрацыі прэпаратаў патрэбныя даследаванні на жывёлах. У гэтым выпадку без ветэрынараў не абысціся. Мы з імі супрацоўнічаем ужо больш за 10 гадоў, пазнаёміліся зусім выпадкова на канферэнцыі. У нас ёсць сумесныя публікацыі, патэнты.

Цяпер прэпарат актуальны не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў іншых краінах. Расія і Казахстан сталі двума асноўнымі экспартнымі рынкамі лекаў, але пра іх ведаюць і ў далёкіх краінах.

– Аднойчы адбылася цікавая гісторыя. На нашага знаёмага, які на той момант працаваў у інстытуце ветэрынарыі, выйшлі людзі з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Прычынай стала тое, што ў аднаго паважанага чалавека захварэў любімы вярблюд і яго ніяк не маглі вылечыць. Знаёмы звярнуўся па дапамогу да нас. У нас для вярблюдаў прэпарата не было, але мы высветлілі, што да вярблюджага бялку бліжэйшы за ўсё бычыны. Мы перадалі прэпарат, і вярблюд у выніку ачуняў, – распавядае Максім.

## Якімі яшчэ даследаваннямі займаецца лабараторыя?

Апрача распрацоўкі ветэрынарных прэпаратаў НДЛ бітэхналогій працуе ў кірунках, якіх раней не існавала. Апошнія 3 гады навукова-даследчая лабараторыя бітэхналогіі сумесна з Інстытутам біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі працуе над тэмай, звязанай з анкалогіяй. У наступным годзе навукоўцы плануюць пачаць работу над тэрапіяй розных анкалагічных захворванняў.

Зараз вядуцца даследаванні лячэння анкалагічных захворванняў з дапамогай пэўных клетак. Стваловыя клеткі бяруцца ў чалавека, вырошчваюцца ў спецыяльных умовах з выкарыстаннем розных дабавак, фактараў росту і бялкоў. Працсей кажучы, клеткі бяруць у пацыента, навучаюць распазнаваць пухлінныя клеткі, а затым зноў уводзяць іх пацыенту. Атрымліваецца аўтатэрапія.

– Інстытут біяфізікі займаецца самімі клеткамі, а мы распрацоўваем бялковыя рэчывы. Яны выкарыстоўваюцца пры вырошчванні гэтых клетак, гэта адносна новы падыход у медыцыне, але дастаткова эфектыўны, – паясняе навуковец. – Паколькі выкарыстоўваюцца ўласныя клеткі арганізма, няма рызыкі, злучанай з адрыньваннем лекаў, імуннымі ці алергічнымі рэакцыямі. Такі падыход не адзіны, яго прымяняюць у комплексным лячэнні.

Падчас даследаванняў біёлагі стварылі тры асноўныя бялковыя субстанцыі, якія ў Беларусі не вырабляюць. Бялкі звычайна імпартуюць з Кітая ці Амерыкі, і каштуюць яны дорага. Як правіла, гэта сотні долараў за некалькі дзясяткаў мікраграмаў. Гэтыя бялкі валодаюць высокай актыўнасцю, часам для выніку дастаткова нанаграмавых колькасцяў. Але ў год выкарыстоўваюцца дзясяткі міліграмаў, а магчымасць ствараць іх у лабараторыі эканоміць нямала грошай.

– Я лічу, што досвед вытворчасці такога рэчыва карысны не толькі з фінансавага пункту гледжання. Высокі кошт, працяглыя тэрміны пастаўкі, рызыка дрэнных умоў захоўвання, страта біялагічнай актыўнасці зніжаюць магчымасць выкарыстання імпартных бялкоў. Мы паспяхова замяняем іх уласнымі распрацоўкамі, а з новага года плануем працаваць яшчэ над адным бялком, які выкарыстоўваецца ў лячэнні, – дзеліцца планамі загадчык лабараторыі.

Студэнты таксама не застаюцца ўбаку. У навукова-даследчай лабараторыі бітэхналогіі існуе сістэма, калі аспіранты і студэнты далучаюцца да агульнай працы, дзякуючы чаму яны могуць не толькі вучыцца, але і прыносіць карысць даследаванням.

Сёлета ў лабараторыі пачаліся работы ў галіне трансплантaлогіі і трансфузіялогіі, а менавіта пераадоленне розных груп крыві ў чалавека. Асноўнай праблемай трансплантaлогіі і пералівання з'яўляецца несумяшчальнасць розных груп крыві. Існуюць розныя падыходы да абязлічвання органа пры трансплантацыі. Змяняюць яго антыгенную структуру, каб не было рэакцыі адрыньвання. Гэта дапаможа рэцыпіенту з рэдкай групай крыві не чакаць гадамі прыдатны орган. У лабараторыі ў гэтым напрамку паспяхова працуе аспірантка, і ўжо ёсць першыя вынікі. Навукоўцы атрымалі 2 ферменты, здольныя расшчапляць несумяшчальныя антыгены.

Максім Патаповіч паведаміў, што працягне працаваць над атрыманнем рэкамбінантных бялкоў і стварэннем новых прэпаратаў ці метадычных падыходаў для рашэння тых ці іншых задач у галіне здароўя чалавека ці жывёл. А на наступны год ужо заяўлены 2 тэмы па распрацоўцы вузкаспецыялізаваных ветэрынарных прэпаратаў.




**Ганна КАЗАКОВА**

УНІВЕРСІТЭТ
30 кастрычніка 2023 года, № 10 (2275)

# З ліфтам за панібрата

**Для сучаснага свету, дзе ўсё хутка змяняецца, ліфцёр у пэўнай ступені экзатычная прафесія. Бясспрэчна, яна далёка не маладая, але, калі спытаць, чым займаюцца такія спецыялісты, мала хто дакладна пералічыць іх абавязкі. Таму наш карэспандэнт разам з ліфцёрам галоўнага корпуса БДУ Кацярынай ЛЯБОШКІНАЙ даведалася больш пра гэту прафесію.**


Кацярына Лябошкіна тлумачыць будову ліфтавага абсталявання

## Штурвал не толькі на караблі

Ліфцёры прыходзяць ва ўніверсітэт а восьмай гадзіне раніцы. Іх працоўны дзень пачынаецца з агляду абсталявання: ці добра функцыянуюць ліфты, ці ёсць масла ў рэдуктары, ці не здарылася працяканняў і іншае. Таксама на працягу дня спецыялісты суправаджаюць функцыянаванне ліфтаў і сочаць за парадкам унутры: калі ўзнікаюць непаладкі, выклікаюць механікаў, калі захрасанні – вызваляюць пасажыраў. Пры пажары ці вучэбнай трывозе іх абавязак – праверыць, ці адбылося самавыключэнне абсталявання. У такія моманты сістэма падае ліфтам сігнал, і спецыялісты спускаюцца на першы паверх, адчыняючы дзверы.

Гераіню матэрыялу сустракаю ў асяроддзі калег. Тут жа з яе слоў даведваюся, што ліфцёр – «ветэран працы», паколькі на гэтай пасадзе шчыруе ўжо 11 гадоў.

– Ну, як сказаць, ветэран. 11 гадоў – гэта сярэдні тэрмін. Калі я толькі прыйшла ў БДУ, у нас працавалі жанчыны па 30 гадоў. Тады быў толькі адзін запіс у працоўнай кніжцы: ты як прыйшоў сюды, так і сышоў на пенсію, – тлумачыць Кацярына Мікалаеўна.

Па дарозе сустракаем яе напарніцу Таццяну Шкрэд. Усяго ж на змене ў пазаадпачынкавы час працуе 4 чалавекі. За кожным з іх замацаваны ўласны ўчастак. Але пры неабходнасці яны прыходзяць на дапамогу калегам з блізкіх карпусоў. Затым утрох падымаемся ў машыннае аддзяленне – сэрца сістэмы кіравання ліфтамі. Дарэчы, звычайна трапіць сюды могуць толькі самі ліфцёры, электрамеханік і механік. Калі ў памяшканне хоча прайсці «чужынец», спрацоўвае сігналізацыя, якую Кацярына Мікалаеўна і Таццяна Віктараўна чуюць у дыспетчарскай.

Машыннае аддзяленне – асаблівая планета з адмысловымі назвамі і, як падаецца выпадковаму госцю, мудрагелістай апаратурай. У ім я паглыбляюся ў прафесійную тэрміналогію сваіх праваднікоў, якія апісваюць механізмы, што мы бачым перад сабой – вось лябёдка, манарэйка, а гэта – штурвал. Дарэчы, апошні дапамагае ліфцёрам пры захрасанні ліфта ўручную спусціць яго да патрэбнага паверха, каб вызваліць пасажыраў.

Збоку, ля сцен машыннага аддзялення, размяшчаюцца датчыкі з вялікай колькасцю лямпачак, за кожнай з якіх замацаваны ўласны парадкавы нумар. Калі запальваецца якая-небудзь з іх, ліфцёр разумее, дзе ў працы сістэмы адбылася памылка. Тут жа можна ўбачыць памяткі-табліцы з расшыфроўкай паказанняў. Напрыклад, калі гарыць лямпачка нумар 50, гэта значыць, што перавышаны кантрольны час закрыцця дзвярэй, калі 49 – іх адкрыцця. Часцей за ўсё, кажуць спецыялісты, паказвае памылку 42 – атрыманне сігналаў розных датчыкаў адначасова.

## «Ліфцёр – часткова псіхолаг»

Адказваючы на пытанне, якія галоўныя якасці ўласцівыя добраму спецыялісту гэтай галіны, жанчыны найперш вылучаюць «жалезны ўнутраны стрыжань»:

– Калі яго няма, чалавек не зможа працаваць. Так толькі здаецца: пайшоў вызваліў – і ўсё. Не, гэта псіхалагічна няпроста, хоць мы ўжо адаптаваліся. Пачатковец заўсёды баіцца. Калі страх не праходзіць, тады варта думаць пра змену прафесіі, – перакананыя гераіні. – Таксама нікуды без самавалодання і добразычлівасці. Калі чалавек у ліфце панікуе, яго патрэбна супакоіць. Таму ліфцёр часткова і псіхолаг. Уявіце: чалавек захрас – у яго стрэс, ён злуецца. Ліфцёр не павінен выказваць гэтыя эмоцыі. Скажаш: «Супакойцеся, калі ласка, усё ў парадку». Людзі ж розныя бываюць. Дарослыя могуць пазлавацца, сказаць, як дрэнна працуюць ліфты, нехта, наадварот, спакайнейшы. Але самыя жыццярадасныя – студэнты. Аднойчы вызвалялі моладзь: тры дзяўчыны і два хлопцы. Яны выйшлі адтуль – смяюцца, шчаслівыя такія. Таму можна сказаць, што ліфцёр – гэта ў нейкай ступені і міні-выратавальнік.



Таццяна Шкрэд і Кацярына Лябошкіна па дарозе да працоўнага месца

Для таго, каб «утаймаваць» сябе ў прафесіі, як кажуць ліфцёры, навічку патрэбны час. Калі чалавек прыходзіць на працу, на месяц за ім замацоўваецца вопытны ліфцёр, які скіроўвае, падказвае і вучыць асаблівасцям прафесіі. Нашы гераіні разабраліся ў спецыфіцы сваёй дзейнасці хутка, таму цяжкасцей у адаптацыі не ўзнікла.

## «Галоўнае - вызваліць чалавека»

Ключавая частка абавязкаў супрацоўніц заключаецца ў вызваленні пасажыраў, якія захраслі ў ліфце. Да гэтай тэмы мы вяртаемся на працягу ўсёй нашай змены:

– Па-сапраўднаму мы выдыхаем, толькі калі ўсе выйшлі з ліфта. Ідэальнае вызваленне – аператыўнае. А лепш за ўсё – папярэдзіць паломку: загадзя запрасіць механіка, праверыць тэхніку. Калі ж захрасанне адбылося, першае, што ад нас патрабуецца – не панікаваць. Нашы прыборы паказваюць, на якім паверсе гэта адбылося, або нам паведамляюць з кабін па сродках сувязі самі пасажыры, – кажуць ліфцёры. – Бывалі выпадкі, калі вызвалялі людзей з асаблівасцямі. Калі, напрыклад, ідзе выклік і мы пасля паўзы чуем стук па сценцы ліфта, разумеем, што чалавек не можа размаўляць. Мы падымаемся, супакойваем людзей. Самі ж разумеем, у кожнага свае асаблівасці: у кагосьці можа быць клаўстрафобія, панічныя атакі, праблемы з сэрцам ці яшчэ нешта. Пасля ідзём у машыннае аддзяленне, адключаем ліфт, уручную апускаем яго да патрэбнага паверха і вызваляем.

Штогод спецыялісты здаюць тэарэтычны экзамен па тэхніцы бяспекі, праходзяць пераатэстацыю. Самы галоўны блок пытанняў заўсёды тычыцца вызвалення людзей, бо гэтыя веды – аснова іх працы. Ліфцёры перакананыя, што, калі чалавек не можа адказаць на такія пытанні, ён дарма вучыўся, і дакументаў аб заканчэнні курсаў ці павышэнні кваліфікацыі яму не выдадуць.

– Важна разумець, што і валоданне тэорыяй не гарантуе адточаных і дакладных дзеянняў пры першым вызваленні. Калі чалавек ніводнага разу не вызваляў, ён будзе хвалявацца. Таму, калі прыходзіць новы супрацоўнік, за ім замацоўваецца вопытны ліфцёр, напрыклад, я ці Таццяна, і чалавек два тыдні працуе пад нашым наглядам. Ён выконвае дзеянні – мы сочым, падказваем, страхуем, адказваем на пытанні. Для таго, каб навічок больш-менш адаптаваўся, патрэбны прыблізна месяц.

Разам з тым жанчыны адзначаюць, што, нягледзячы на адказнасць працы, эмацыйнае выгаранне – зусім не пра іх.

– Калі здараецца захрасанне, пасля вызвалення мне трэба адасобіцца. Тады я завараю сабе каву, саджуся за стол: п'ю яе ў адзіноце, расслабляюся, а пасля, праз паўгадзінкі, калі адпусціць, вяртаюся да людзей, – адказвае Кацярына Мікалаеўна.

– Галоўнае – вызваліць чалавека. Тады я ведаю, што ён у бяспецы, і добра сябе адчуваю, адразу ўзнікае задаволенасць. Стрэс спачатку таксама нікуды не дзяваецца, але ён сыходзіць на задні план. Сваю працу ты ўжо зрабіў, і калі паломка больш сур'ёзная, то трэба толькі дачакацца механіка, – дадае Таццяна Віктараўна.

Па словах маіх гераінь, такім спецыялістам можа стаць чалавек любой прафесіі. Адзінае, што для гэтага патрэбна, – прайсці паўгадавыя курсы. І абодва ліфцёры – галоўны доказ таго: Кацярына Мікалаеўна прыйшла ў БДУ пасля працы бухгалтарам, Таццяна Віктараўна працавала на кране.

## Спецыялісты, што могуць усё

Працоўная змена ліфцёраў доўжыцца да 21-й гадзіны. Да такога раскладу прызвычаіліся не толькі самі працаўніцы, але і іх родныя. Кацярына Мікалаеўна заўважае, што, калі прафесія прыносіць задавальненне, час ідзе хутка.

Дома жанчыны – сапраўдныя гаспадыні. Адна вырошчвае агародніну і даглядае садовыя дрэвы на лецішчы, другая любіць вязаць на прутках.

– Ліфцёр – гэта, хутчэй, хобі, дзе ты можаш рэалізавацца прафесійна, развіць чалавечыя якасці, праявіць сябе ў адносінах з калегамі. Калі вызваляем некага з ліфта, усё ў парадку – з'яўляецца гонар за сябе, павышаецца самаацэнка. У такія моманты мы разумеем, што мы патрэбныя, бо, што ні кажы, ліфт – месца павышанай небяспекі, – кажа Кацярына Мікалаеўна.

– Мы ўсё ўмеем. Захочацца шыць – нешта пашыем, будзе жаданне вязаць – звяжам, – усміхаецца яе калега.

Плячо таварыша ў гэтай прафесіі – галоўнае. Патрэбна, каб напарнік быў надзейны. Калегі неабавязкова павінны быць самымі лепшымі сябрамі, але выручыць адзін аднаго заўсёды гатовыя. Таму на зменах ліфцёраў усё звычайна «схоплена».

– Мы з Таццянай ганарымся, што прыйшоў карэспандэнт, які распытвае пра нашу працу. Хочацца, каб людзі разумелі, што яна важная, – на развітанне падзяліліся ліфцёры.

**Ірына ІВАШКА**

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'яўляе конкурс
## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

**Фізічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі | 5 гадоў | вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Загадчык кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі | 1 год | |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315, да 28 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326, да 28 снежня (дадаткова будзе паведамлена кандыдатам на пасаду).

**Інстытут бізнесу БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Дацэнт кафедры бізнес-адміністравання | 1 год | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры інавацыйнага кіравання | 3 гады | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры лагістыкі | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Старшы выкладчык кафедры фінансаў і менеджменту | – | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |
| Старшы выкладчык кафедры прававых і гуманітарных дысцыплін | – | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, што адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 203, да 28 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 213, да 28 снежня (дадаткова будзе паведамлена кандыдатам на пасаду).

**Эканамічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Дацэнт кафедры карпаратыўных фінансаў | 3 гады | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Выкладчык-стажор кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі | | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра ці вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык» без прад'яўлення патрабаванняў да стажу працы. |
| Выкладчык кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі | | Вышэйшая адукацыя, якая адпавядае педагагічнай дзейнасці, ці вышэйшая адукацыя, што адпавядае навучальнаму прадмету (навучальнай дысцыпліне), і перападрыхтоўка па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» без прад'яўлення патрабаванняў да стажу працы. |
| Старшы выкладчык кафедры міжнароднай палітычнай эканоміі (0,5 стаўкі) | | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: вул. К.Маркса, д. 31, каб. 65, да 28 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: вул. К.Маркса, д. 31, каб. 65, да 28 снежня.

**Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Дацэнт кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 223, да 28 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 213, да 28 снежня.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі | 3 гады | На пасаду дацэнта прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры сацыялогіі | 3 гады | На пасаду дацэнта прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Старшы выкладчык кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі | 3 гады | На пасаду старшага выкладчыка прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю і стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 3 гады. |
| Старшы выкладчык кафедры агульнай і медыцынскай псіхалогіі | 2 гады | На пасаду старшага выкладчыка прымаецца асоба, што мае вышэйшую адукацыю і стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 3 гады. |
| Старшы выкладчык кафедры сацыяльнай працы і рэабіліталогіі | 4 гады | На пасаду старшага выкладчыка прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю і стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 3 гады. |
| Прафесар кафедры сацыяльнай працы і рэабіліталогіі | 2 гады | На пасаду прафесара прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы ці вынаходствы, патэнты, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай працы і рэабіліталогіі | 2 гады | На пасаду дацэнта кафедры прызначаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы, досвед навуковай, арганізатарскай і практычнай працы па спецыяльнасці не менш за 5 гадоў. |
| Загадчык кафедры сацыяльнай працы і рэабіліталогіі | 4 гады | На пасаду загадчыка кафедры прызначаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, к. 528, да 28 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, к. 528, да 28 снежня.

*(дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**Факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Загадчык кафедры сістэмнага аналізу і камп’ютарнага мадэлявання | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Дацэнт кафедры сістэмнага аналізу і камп’ютарнага мадэлявання | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры фізічнай электронікі і нанатэхналогій | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: вул. Бабруйская 7, пакой 423; да 28 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: вул. Курчатава, 5, пакой 605, да 28 снежня.

**Механіка-матэматычны факультэт абвяшчае конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Загадчык кафедры бія- і нанамеханікі | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Загадчык кафедры вэб-тэхналогій і камп’ютарнага мадэлявання | 5 гадоў | |
| Загадчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі | 5 гадоў | |
| Дацэнт кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры тэорыі функцый | 1 год | |
| Дацэнт кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі | 5 гадоў | |
| Дацэнт кафедры функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі | 5 гадоў | |
| Дацэнт кафедры геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі | 2 гады | |
| Дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі | 2 гады | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры вэб-тэхналогій і камп’ютарнага мадэлявання | 5 гадоў | |
| Дацэнт кафедры вэб-тэхналогій і камп’ютарнага мадэлявання | 3 гады | |
| Старшы выкладчык кафедры тэорыі функцый | – | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |
| Старшы выкладчык кафедры тэорыі функцый | – | |
| Старшы выкладчык кафедры вэб-тэхналогій і камп’ютарнага мадэлявання | – | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: пр. Незалежнасці, 4, пакой 207, да 28 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: пр. Незалежнасці, 4, пакой 207, да 28 снежня.

*(дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Загадчык кафедры вылічальнай матэматыкі | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Загадчык кафедры матэматычнага мадэлявання і аналізу даных | 5 гадоў | |
| Дацэнт кафедры камп’ютарных тэхналогій і сістэм | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі | 5 гадоў | |
| Дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі | 5 гадоў | |
| Дацэнт кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі | 5 гадоў | |
| Дацэнт кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі | 1 год | |
| Дацэнт кафедры інфармацыйных сістэм кіравання | 5 гадоў | |
| Старшы выкладчык кафедры тэхналогій праграмавання | 4 гады | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |
| Старшы выкладчык кафедры камп’ютарных тэхналогій і сістэм | 5 гадоў | |
| Старшы выкладчык | 5 гадоў | |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: дэканат факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, каб. 509).
Тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе – да 28 лістапада.
Месца (адрас) правядзення конкурсу: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, каб. 518.
Дата правядзення конкурсу – на працягу месяца (30 каляндарных дзён) пасля завяршэння тэрміну падачы заяў, трэці аўторак пасля завяршэння тэрміну падачы заяў, пачатак у 13:00.

## ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

**Фізіка-тэхнічная лабараторыя**
Малодшы навуковы супрацоўнік – 1 чалавек.

**Лабараторыя нанаэлектрамагнетызму**
Старшы навуковы супрацоўнік – 1 чалавек.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб’явы.
Адрас: 220006, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 352 42 31.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 30.10.2023 г.
Зак. 973. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

**Рэдактар** Уладзіслаў Уладзіміравіч ПАЛУКОШКА
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***